чинить свою жизнь вопросам, связанным со своей будущей профессией. Укрепляет позицию восприятия себя как творческой активной личности или специалиста-исполнителя, умеющего соответствовать предъявленным к нему требованиям.

Все названные виды деятельности несут на себе аспект социально-экологической подготовки только в случае комплексной экологизации, рассматриваемой нами как основное средство реализации культурологического подхода.

---

[1] Психолого-педагогический словарь для учителей и руководителей общеобразовательных учреждений. Ростов н/Д, 1998. С. 210.

[2] *Горовая В. И.* Теоретические основы подготовки специалиста в условиях многоуровневого высшего педагогического образования: Автореф. дис. ... д-ра педагог. наук: 13.00.01. С. 3.

[3] *Ожегов С. И.* Словарь русского языка. М., 1978. С. 344.

[4] Психолого-педагогический словарь ... С. 590.

[5] *Абдулина О. А.* Общепедагогическая подготовка учителя в системе высшего педагогического образования. М., 1990. С. 21.

[6] *Харламов И. Ф., Горленко В. П.* Педагогическая практика: старые и новые подходы // Педагогика. 1997. № 4. С. 72—78.

[7] *Бабанский Ю. К.* Педагогика: Учеб. пособие для педагог. ин-тов. М., 1988.

[8] *Смирнов С. А.* Педагогика: Педагог. теории, системы, технологии. 4-е изд. М., 2000. С. 94.

[9] *Баранов С. П.* Педагогика: Учеб. пособие для студентов по специальности № 2112 "Педагогика и методика начального обучения". М., 1976.

[10] *Смирнов С. А.* Педагогика. С. 95.

[11] Профессиональная педагогика: Учеб. для студентов, обучающихся по педагог. специальн. и направлениям. М., 1997. С. 285.

[12] *Суртаева Н. Н.* Проектирование педагогических технологий в профессиональной подготовке учителя (на прим. естественно-науч. дисциплин): Автореф. дис. ... д-ра педагог. наук: 13.00.01. С. 4.

[13] *Зубра А. С.* Среда, формирующая личность // Адукацыя і выхаванне. 2000. № 8. С. 30.

[14] *Дорошко О. М., Климуть Е. Н.* Социально-экологическая подготовка учителя // Технообраз — 2001. — Материалы III Международной научной конференции "Технологии непрерывного образования и творческого саморазвития личности". Гродно, 2001. Т. 1. С. 261—264.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Т. В. Кузьмініч (Мінск),*
*дацэнт кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, кандыдат педагагічных навук*

# НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ РАБОТА СТУДЭНТАЎ ЯК ФОРМА ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У ГАЛІНЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ І БІБЛІЯГРАФІІ

Падрыхтоўка спецыялістаў, якія не толькі валодаюць пэўнай сукупнасцю агульнаадукацыйных і прафесійных ведаў, але і папаўняюць і паглыбляюць свае веды, пастаянна павышаюць свой тэарэтычны і прафесійны ўзроўні, актыўна ўдзельнічаюць у працэсе ўдасканалення грамадскай практыкі, патрабуе ад ВНУ эфектыўнага ўкаранення і пастаяннага ўдас-

каналення разнастайных форм навучання і выхавання студэнтаў. Важнае месца тут належыць студэнцкай навукова-даследчай рабоце (НДР). Гэта абумоўлена складанасцю і інтэнсіўнасцю грамадскага жыцця, паскарэннем і ўскладненнем інфармацыйных працэсаў.

Ад якасці адукацыі, умення выкарыстоўваць у сваёй рабоце ўсё новае, што з'яўляецца ў навуцы і практыцы, пастаянна аналізаваць сваю прафесійную дзейнасць, самастойна вызначаць накірункі яе ўдасканалення і выпрацоўваць адпаведныя алгарытмы залежыць якасць выканання спецыялістам сваіх прафесійных абавязкаў, а ў канчатковым выніку — узровень дзейнасці наогул і адпаведнасць яе патрабаванням сучаснай грамадскай практыкі. Аснова гэтага закладваецца ў ВНУ, у прыватнасці праз актыўны ўдзел студэнтаў у правядзенні навуковых даследаванняў. І, зразумела, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры надае гэтаму належную ўвагу. На ўзроўні універсітэта і факультэтаў створаны саветы па навукова-даследчай рабоце студэнтаў, якія займаюцца пераважна арганізацыйнымі праблемамі. Асноўная работа па далучэнні студэнтаў да навуковай дзейнасці, кіраўніцтва ёю вядзецца на кафедрах. Кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм, бібліяграфіі і дакументазнаўства, бібліятэказнаўства не толькі як кафедры выпускаючыя, але і як адно са звёнаў развіцця айчыннай інфарматыкі, бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства, клапоцяцца аб навуковай творчасці студэнтаў, як састаўной частцы якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў, і фарміраванні айчыннай інфармацыйнай, бібліяграфазнаўчай, бібліятэказнаўчай навуковых школ. Студэнцкая навука для большасці навукоўцаў-выкладчыкаў і навукоўцаў-практыкаў — гэта пачатак навуковай дзейнасці.

Далучэнне студэнтаў да навуковай творчасці магчыма ў аўдыторны і па-за аўдыторны час. Гэта — уключэнне элементаў навуковых даследаванняў у розныя віды аўдыторных заняткаў; чытанне спецыяльных лекцыйных курсаў па арганізацыі НДР; уключэнне заняткаў па формах і метадах правядзення навуковых даследаванняў пры чытанні шэрага спецыяльных дысцыплін, у прыватнасці — "Тэорыя бібліяграфіі", "Бібліятэказнаўства. Тэорыя", "Маркетынг", "Сацыялогія і псіхалогія чытання" і інш.; напісанне курсавых і дыпломных работ; выкананне заданняў у межах самастойнай работы; удзел у навуковых канферэнцыях, у конкурсах студэнцкіх навуковых работ; арганізацыя работы студэнцкіх навуковых гурткоў; правядзенне спецсемінараў і інш. Амаль па ўсіх гэтых накірунках выкладчыкамі кафедр факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм (ФБІС) БДУ культуры праводзіцца адпаведная работа. У прыватнасці, шырока прымяняецца чытанне праблемных лекцый, правядзенне дзелавых гульняў ("Дзён бібліяграфіі", "Дзён спецыяліста", "круглых сталоў" і канферэнцый).

Амаль па ўсіх чытаемых курсах прадугледжана падрыхтоўка рэфератаў і абмеркаванне іх на семінарскіх занятках ці пры гутарцы з выкладчыкам. Пры гэтым тэматыка заданняў пастаянна змяняецца, прыводзіцца ў адпаведнасць з інтэнсіўна абнаўляемай бібліятэчна-бібліяграфічнай практыкай. Падрыхтоўка такіх рэфератаў дазваляе часам вызначыць кола навуковых інтарэсаў студэнта і адпаведна акрэсліць праблематыку курсавых і дыпломнай работ ці карэкціраваць іх (у выпадку, калі тэма даследавання цікавая для студэнта і распрацоўка яе ідзе актыўна).

Пералік тэм і аналіз змястоўнага напаўнення заданняў для самастойнай работы студэнтаў таксама сведчаць аб тым, што выкладчыкі кафедр кла-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

поцяцца аб уключэнні ў яе элементаў творчасці і навуковага пошуку. На самастойнае вывучэнне выносяцца не толькі добра распрацаваныя ў навуковым друку тэмы, але і дыскусійныя, напрыклад "Кніга і цэнзура", "Бібліяграфія ў сістэме сумежных галін ведаў" і інш. Па ўсіх тэмах, прапанаваных для самастойнага вывучэння, даюцца спісы літаратуры, метадычныя парады, пытанні для самакантролю, прычым студэнтам прапаноўваюцца заданні не па кампіляцыйным узнаўленні матэрыялу, а па яго творчай перапрацоўцы, акцэнтуецца ўвага на выказванне ўласных думак і неабходнасць абгрунтавання ўласных меркаванняў і вывадаў.

Але, зразумела, найбольш актывізуецца НДР студэнтаў пры напісанні курсавых і дыпломных работ. Пры гэтым увага і намаганні студэнта канцэнтруюцца ў межах аднаго накірунку, у рэчышчы якога ён вывучае як накоплены навукай арсенал, так і сучасную яму рэчаіснаць, праводзіць уласны аналіз, а часам і адчувае, наколькі карысныя яго навуковыя намаганні для практыкі.

Кафедры штогод абмяркоўваюць і зацвярджаюць тэматыку курсавых і дыпломных работ, якая адпавядае кафедральным навуковым тэмам. Некаторыя з тэм распрацоўваюцца па заяўках бібліятэк. Для студэнтаў вельмі важна адчуваць рэальную карысць ад сваіх навуковых намаганняў, бачыць створаную асабіста інфармацыйную прадукцыю. Менавіта таму конкурсныя навуковыя работы, выкананыя ў цесным супрацоўніцтве з бібліятэкамі, як правіла, высока ацэньваюцца рэцэнзентамі-навукоўцамі і рэцэнзентамі-практыкамі. Можна прывесці прыклады работ такіх студэнтаў-выпускнікоў, як Верас Н., якая на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі даследавала кнігадрукаванне Берасцейшчыны XVI стагоддзя і Настюшкінай Н., якая стварыла фрагмент інфармацыйна-пошукавай мовы па фізічнай культуры і спорце па заказе Рэспубліканскай навукова-метадычнай бібліятэкі па фізічнай культуры і спорце. Калі ёсць зацікаўленасць з боку практыкаў, бачны канкрэтныя вынікі работы, то гэта пэўным чынам стымулюе даследчыцкую дзейнасць студэнтаў і спрыяе фарміраванню ўяўлення аб творчым характары абранай прафесіі, а падчас прафесійнай дзейнасці можа стаць адной з састаўляючых устойлівага інтарэсу да тых ці іншых праблем бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства. На жаль, на ФБІС не пашырана практыка выканання курсавых і дыпломных работ па заяўках бібліятэк. На наш погляд, пры вызначэнні іх тэматыкі мэтазгодна наладзіць цеснае супрацоўніцтва не толькі з навуковымі, публічнымі, спецыяльнымі бібліятэкамі, але, улічваючы пералік спецыялізацый і распаўсюджанасць бібліяграфічнай дзейнасці ў розных грамадскіх інстытутах, і з кнігагандлёвымі і кнігавыдавецкімі прадпрыемствамі, архівамі, Кніжнай палатай, органамі інфармацыі. Прычым магчыма распрацоўка тэматыкі курсавых і дыпломных работ на перспектыву, на некалькі гадоў наперад.

Студэнты факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм удзельнічаюць у разнастайных універсітэцкіх, рэспубліканскіх, міжнародных навуковых канферэнцыях і чытаннях. Універсітэцкія навуковыя студэнцкія канферэнцыі праводзяцца штогод. Да іх далучаецца шырокае кола студэнтаў факультэта: для пяцікурснікаў — гэта абавязковая апрабацыя дыпломнай работы (перадабарона); для астатніх — добраахвотная магчымасць прадэманстраваць свае здольнасці, падзяліцца ўласнымі навуковымі доследамі. Практыка паказвае, што студэнты ФБІС выступаюць з арыгінальнымі дакладамі, зацікаўлена і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часам эмацыянальна абмяркоўваюць узнятыя пытанні, выказваюць слушныя прапановы па ўдасканаленні практычнай дзейнасці. Гэта дазваляе ім вучыцца адстойваць свае погляды і меркаванні па пэўных практычных і тэарэтычных пытаннях, адчуць сябе спецыялістамі-навукоўцамі, што ў сваю чаргу стымулюе далейшую працу над тэмай і спрыяе цікавасці да навуковай дзейнасці наогул.

Неабходна адзначыць, што на універсітэцкіх канферэнцыях абавязкова выступаюць саіскальнікі, магістранты і аспіранты. Гэта значна ўзмацняе ўзровень пленарных і секцыйных пасяджэнняў, стварае сапраўдную атмасферу творчага пошуку, абмену думкамі, арыентуе студэнтаў на прадаўжэнне вучобы. Не стала выключэннем у гэтым сэнсе XXVI студэнцкая канферэнцыя (красавік 2001 г.). Яна прадэманстравала шырокі спектр праблем, якія цікавяць студэнтаў ФБІС як будучых спецыялістаў і, наогул, добраадукаваных і творчых асоб. Гэта — асаблівасці інфармацыйных зносін у грамадстве, фарміраванне інфармацыйнай культуры розных груп карыстальнікаў, стварэнне традыцыйнай і аўтаматызаванай бібліяграфічнай прадукцыі, бібліятэчнае абслугоўванне розных чытацкіх катэгорый, бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства і інш. Часцей за ўсё ў такіх канферэнцыях удзельнічаюць пяцікурснікі, радзей — студэнты III, IV курсаў і студэнты факультэта завочнага навучання, а слухачамі на секцыйных пасяджэннях з'яўляюцца самі выступоўцы і адзін-два выкладчыкі той ці іншай кафедры. Гэта не дазваляе поўнасцю рэалізаваць магчымасці такой формы, як навуковая канферэнцыя, па выпрацоўцы і распаўсюджванні новых ведаў, заахвочванні ў навуковай дзейнасці моладзі. Неабходна запрашаць студэнтаў і II, і III, і абавязкова IV курса. Для гэтага мэтазгодна больш шырока рэкламаваць тыдзень студэнцкай навукі, а дзень правядзення канферэнцыі рабіць вольным ад аўдыторных заняткаў.

Удзел студэнтаў ФБІС у рэспубліканскіх і міжнародных навуковых форумах, на жаль, хутчэй выключэнне, чым заканамерная з'ява. Студэнты павінны мець не толькі своечасовую і поўную інфармацыю аб падобных мерапрыемствах, але яшчэ і моцную падтрымку (псіхалагічную, фінансавую) з боку дэканата, адчуваць зацікаўленасць і клопат навуковага кіраўніка.

Штогод праводзіцца Рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ. Гэта яшчэ адна вельмі добрая магчымасць стымуляваць студэнцкую навуковую дзейнасць, прычым не толькі маральна, але і матэрыяльна. Студэнты ФБІС, як правіла, прадстаўляюць работы па раздзелу "Бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства". Радзей па іншых накірунках. Напрыклад, у 2000 годзе толькі адна праца была прадстаўлена па філасофіі (дарэчы, студэнтам трэцяга курса А. Кутавенка, работа атрымала III ступень). Практычна ўсе работы, выстаўленыя на конкурс, а іх было 17, атрымалі добрыя водгукі ад рэцэнзентаў, дзве работы атрымалі першую катэгорыю, чатыры — другую, дзевяць — трэцюю і толькі дзве работы не атрымалі катэгорыі (гэта 11 % ад агульнай колькасці). У параўнанні з паказчыкамі па іншых камісіях Рэспубліканскага конкурсу, гэта добры паказчык. Трэба адзначыць, што на конкурс прадстаўляюцца, у асноўным, дыпломныя праекты. А гэта значыць, што большасць аўтараў (былых студэнтаў, а падчас правядзення конкурса — маладых спецыялістаў), магчыма, не будуць зацікаўлены ці не будуць мець спрыяльных умоў для далейшай распрацоўкі тэмы, рабіць публікацыі, удзельнічаць у конкурсе студэнцкіх работ і набываць вопыт афар-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

млення работы, удасканальвання яе зместу. А такое было б магчыма, калі б ў конкурсе студэнцкіх навуковых работ удзельнічалі студэнты, пачынаючы з III ці IV курса.

Неабходна звярнуць увагу на якасць пададзенай інфармацыі ў студэнцкіх навуковых работах. У параўнанні са студэнтамі творчых факультэтаў БДУ культуры, будучыя бібліятэкары-бібліёграфы лепш валодаюць методыкай правядзення даследавання, пошуку інфармацыі, яе аналізу, прадстаўлення атрыманых вынікаў. Таму работы выкананы на значна вышэйшым узроўні. Гэтаму спрыяе, па-першае, спецыфіка абранай прафесіі і, адпаведна, пералік чытаемых дысцыплін; па-другое, стараннасць, уседлівасць і уважлівасць студэнтаў як якасці, неабходныя для спецыяліста ў сферы бібліятэчнай справы і бібліяграфіі, фарміраванне якіх пачынаецца ў ВНУ; па-трэцяе, чытанне курсаў "Асновы навукова-даследчай работы" (для студэнтаў II курса) і "Арганізацыя навукова-даследчай работы" (для магістрантаў), якія знаёмяць са спецыфікай навуковай дзейнасці, метадамі правядзення навуковых даследаванняў, методыкай напісання абгрунтавання курсавых і дыпломных работ, перапрацоўкай тэкставай інфармацыі, асаблівасцямі прадстаўлення вынікаў уласнага фактaлагічнага аналізу. Тым не менш, у конкурсных працах студэнтаў ФБІС сустракаюцца яўныя парушэнні нормаў цытавання. Камп'ютэрныя тэхналогіі дазваляюць сучаснаму студэнту, не затрачваючы асаблівых інтэлектуальных намаганнняў, акрамя пошуку інфармацыі (які можа быць і не самастойным), прадставіць у вельмі сціслы час кампіляцыйную работу ці нават плагіят. Ужо зараз прыходзіцца сутыкацца з праблемай сканіраваных дакладаў, рэфератаў, і гэта ва умовах, калі камп'ютэр пакуль што не з'яўляецца абавязковай часткай тэхнічнага абсталявання пакоя студэнта. Супрацьстаяць пашырэнню такой негатыўнай з'явы магчыма праз зацвярджэнне тэм, набліжаных да бібліятэчнай, кніжнапалацкай, кнігаганлёвавыдавецкай, навукова-інфармацыйнай і іншых відаў дзейнасці, звязаных са стварэннем, кумуляваннем, перапрацоўкай і распаўсюджваннем інфармацыі; праз фарміраванне адпаведных этычных норм у студэнта — будучага навукоўцы і практыка. Мэтазгодным бачыцца чытанне спецкурса "Інфармацыйная этыка", а таксама ўвядзенне ў курс "Асновы НДР" тэмы "Этыка навуковай дзейнасці", прычым з абавязковым абмеркаваннем яе на семінарскіх занятках.

Падагульняючы вышэй сказанае, можна адзначыць, што на ФБІС студэнцкую навуковую работу разглядаюць як эфектыўную форму падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі, як адну з састаўляючых фарміравання айчынных бібліятэчнай і бібліяграфічнай навуковых школ. На факультэце існуюць сталыя традыцыі і праводзіцца станоўчая работа. У мэтах актывізацыі яе мэтазгодна: пры вызначэнні тэматыкі курсавых і дыпломных работ цясней супрацоўнічаць з бібліятэкамі, Кніжнай палатай, магчыма, кнігаганддлёвымі і кнігавыдавецкімі прадпрыемствамі, архівамі; актывізаваць работу па інфармаванні студэнтаў аб конкурсах навуковых работ, канферэнцыях; матэрыяльна заахвочваць студэнтаў, якія займаюцца навуковай дзейнасцю, і іх навуковых кіраўнікоў; прыцягваць да пасіўнага і актыўнага ўдзелу ў студэнцкіх канферэнцыях студэнтаў II, III, IV курсаў; актывізаваць публікаванне вынікаў НДР студэнтаў — тэзісаў канферэнцый і навуковых артыкулаў — у прафесійным друку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ